**ДЗЯРЖАЎНЫ МЫТНЫ КАМІТЭТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

*вул. Магілеўская, 45/1, 220007, г. Мінск*
*тэл. 218 90 00, факс 218 91 97, 218 91 94*
*e-mail: gtk@customs.gov.by*

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТАМОЖЕННЫЙ КОМИТЕТ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

*ул. Могилевская, 45/1, 220007, г. Минск*
*тел. 218 90 00, факс 218 91 97, 218 91 94*
*e-mail: gtk@customs.gov.by*

30.03.2017 № Г-387

На № ____________ ад ____________

Аб разглядзе калектыўнага звароту

У Дзяржаўным мытным камітэце Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі разгледжаны калектыўны зварот грамадзян аб увядзенні мытнага кантролю на беларуска-расійскай мяжы.

У сувязі са стварэннем Мытнага саюза і падпісаннем Рэспублікай Беларусь Пагаднення аб Мытным саюзе паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй ад 6 студзеня 1995 года мытны кантроль на беларуска-расійскай мяжы адменены.

Мэтай узнікнення такога Мытнага саюза з'яўляецца:

забеспячэнне сумеснымі дзеяннямі сацыяльна-эканамічнага прагрэсу дзяржаў шляхам устранення паміж імі размежавальных перашкод для бесперашкоднага эканамічнага ўзаемадзеяння паміж гаспадарчымі суб'ектамі;

гарантаванне ўстойлівага развіцця эканомікі, свабоднага тавараабмену і добрасумленнай канкурэнцыі;

умацаванне каардынацыі эканамічнай палітыкі дзяржаў і забеспячэнне ўсебаковага развіцця нацыянальнай народнай гаспадаркі;

стварэнне ўмоў для фарміравання агульнай эканамічнай прасторы;

стварэнне ўмоў для актыўнага выхаду дзяржаў – удзельніц Мытнага саюза на сусветны рынак.

Такім чынам, стварэнне Мытнага саюза, у тым ліку і адмена на сумеснай мяжы мытнага кантролю, адбылося ў эканамічных мэтах. Суверэнітэт дзяржавы быў не закрануты.

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя маюць адзінае мытнае заканадаўства, што дазваляе сумесна прымаць меры па прадухіленні ўвозу на тэрыторыю Мытнага саюза забароненых тавараў і кантрабанды.

Што датычыцца перамяшчэння зброі і наркатычных сродкаў, то ў мэтах барацьбы з незаконным абаротам гэтых тавараў упаўнаважанымі

праваахоўнымі органамі прымаецца комплекс мер, які ўключае не толькі кантроль на мяжы.

Напрыклад, мытнымі органамі шырока выкарыстоўваюцца аператыўныя мабільныя групы ў мэтах кантролю за перамяшчэннем тавараў і транспартных сродкаў на найбольш небяспечных у гэтым плане участках, у тым ліку і ў непасрэднай блізкасці ад беларуска-расійскай мяжы.

Такім чынам, улічваючы інтэграцыйныя эканамічныя працэсы, у тым ліку ўступленне ў Еўразійскі эканамічны саюз, Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь не знаходзіць падстаў для ўвядзення на беларуска-расійскай мяжы мытнага кантролю.

У адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 22 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» просім Вас праінфармаваць іншых заяўнікаў аб выніках разгляду звароту.

Першы намеснік
Старшыні

У.М.Арлоўскі